УДК 94(475)"1940/1950"

# САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫЯ ПЕРАЎТВАРЭННІ НА ТЭРЫТОРЫІ СІТЦАЎСКАГА, ПАРАФ'ЯНАЎСКАГА І ДОКШЫЦКАГА СЕЛЬСАВЕТАЎ ДОКШЫЦКАГА РАЁНА БССР У КАНЦЫ 1940-х ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ 1950-х гг.

**Згірскі Ю. І.**
Музей боевой славы филиал Научно-исследовательского и просветительного учреждения культуры «Национальный Полоцкий историко-культурный музей-заповедник»
(г. Полацк, Рэспубліка Беларусь)
Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. В. Сумко

Анатацыя. Аўтарам артыкула, на падставе архіўных матэрыялаў і матэрыялаў вуснай гісторыі, было прааналізавана становішча Параф'янаўскага, Сітцаўскага і Докшыцкага сельскіх саветаў з 1945 па 1950-х гадоў, тэрыторыі якіх да Другой сусветнай вайны ўваходзілі ў склад Параф'янаўскай і Докшыцкай гмін Віленскага ваяводства Польскай Рэспублікі.

Ключавыя словы: Заходняя Беларусь, БССР, пасляваенны час.

Summary. The author of the article, based on archival and oral history materials, analyzed the situation of the Parafjanov, Sitcy and Doksycy village councils from 1945 to the 1950s, whose territories before World War II were part of the Parafjanov and Doksycy communes of the Vilnius Voivodeship of the interwar Republic of Poland.

Key words: Western Belarus, BSSR, Postwar period.

Па выніку Другой сусветнай вайны, тэрыторыя Заходняй Беларусі засталася ў складзе СССР, за выключэннем Беласточчыны. Апошняя, згодна з пасляваеннымі дамоўленнасцямі паміж Савецкім Саюзам і Польшчай, была перададзена Польшчы. Былое Віленскае ваяводства пасля вайны было прадстаўлена Віленскім краем Літоўскай ССР і тэрыторыямі, якія былі ў складзе спачатку Полацкай і Вілейскай/Маладзечанскай абласцей БССР, а з 1960-х гг. у складзе Мінскай і Віцебскай абласцей БССР. Тэрыторыі Докшыцкага і Параф'янаўскага сельсаветаў, якія ў міжваенны перыяд былі цэнтрамі Докшыцкай і Параф'янаўскай гмін Віленскага ваяводства, сталі ядром наваствoранага Докшыцкага раёна, які з перапынкам у 1960-х гг. існуе па сённяшні дзень.

Вылучаюцца дзве катэгорыі крыніц, якія адлюстроўваюць падзеі 1945-1960 гг.:

- Архіўныя матэрыялы.
- Матэрыялы вуснай гісторыі.

Першыя прадстаўлены матэрыяламі справаводства органаў выканаўчай улады Докшыцкага і Параф'янаўскага сельсаветаў. Апошнія захаваліся ва ўстанове "Занальны дзяржаўны архіў г. Глыбокае". Дакументы рукапісныя і напісаны пераважна на аркушах з сшыткаў. Таксама, у якасці лістоў выкарыстоўваліся адвароты пустых бланкаў і дакументаў часоў Польскай Рэспублікі і нямецкай акупацыі. Пераважны (заўв. колькасна) тып дакументаў – пратаколы сабранняў. Мова дакументаў – руская. Самы ранні дакумент датуецца 1949 г., што можа быць звязана з запаздалым пачаткам вядзення справаводства ці незахаванасцю дакументаў па гэтаму перыяду [3, с. 1].

Згодна з пратаколамі сабранняў Гарсавета г. Докшыцы, асноўныя кіруючыя пасады займалі пераважна выхадцы з даваеннай тэрыторыі СССР. Напрыклад: Намеснікам Гарсавета г. Докшыцы на момант 1949-1951 гадоў і фактычным кіраўніком Докшыцкага сельсавета з'яўляўся Смірноў Яўгеній Арсен'евіч, выхадзец з усходніх рэгіёнаў СССР (заўв. адносна наваствoранага Докшыцкага раёна). Мясцовыя жыхары займалі кіруючыя пасады пераважна на правінцыі і ў якасці адказных за асобныя вуліцы горада і адказных за вёскі (рус. Уполномоченые по улице (назва вуліцы) і уполномоченный по деревне). Апошняя пасада (заўв. уполномоченный по деревне) далей трансфармавалася ў пасаду старэйшыны вёскі, што захавалася да нашага часу [3, с. 2].

Цікавым фактам з'яўляецца запаздалае перайменаванне большасці вуліц насельных пунктаў. У перыяд з 1945 па 1949 гг. адбыліся перайменаванні асноўных вуліц насельных пунктаў, пры захаванні часткі назваў вуліц, якія існавалі да 1939 г. Напрыклад: згодна з архіўнымі матэрыяламі, у горадзе не былі перайменаваны вуліцы Татарская і Уланская, што вядома праз фіксацыю наяўнасці на гэтых вуліцах агародаў жыхароў г. Докшыцы [3, с. 11].

Асобная фіксацыя наяўнасці агародаў на пэўных вуліцах сведчыць аб складаным эканамічным становішчы жыхароў г. Докшыцы: патрэба ў апрацоўцы зямлі гараджанамі можа сведчыць аб дрэнным забеспячэнні горада прадуктамі і, як вынік, сведчыць аб разрыве былых эканамічных сувязяў "вёска-горад-вёска". Пры гэтым, жыхары вёсак Докшыцкага і Параф'янаўскага сельсаветаў, якія мелі коней, павінны былі займацца лесазагатоўкамі [3, с. 3]. Апошняе стала прычынай выкарыстання кароў для апрацоўкі зямлі. [3, с. 2] Падобная практыка выкарыстання жывёл сведчыць аб дэфіцыце іх у мясцовага насельніцтва, што стала прычынай дазволу на здачу малака замест мясца [3, с. 3].

Галоўны акцэнт эканамічнай дзейнасці з'яўлялася лесазагатоўка, аб чым сведчыць вышэйзгаданы факт і мабілізацыя непрацаўладкаваных мужчын на нарыхтоўкі лесу праз усталяванне нормы на кожнага безпрацоўнага мужчыну [3, с. 3].

Апроч вышэйзгаданнага, праводзілася актыўная агітацыя сярод мясцовага насельніцтва ў "Красные обозы" (заўв. выезд на працу за межы тагачаснай БССР, а таксама вываз часткі сельскагаспадарчых тавараў праз загатоўчы пункт ў Параф'янаве) [3, с. 2]. Згодна з матэрыяламі вуснай гісторыі, асноўнымі кірункамі выезду на працы былі: Урал (РСФСР), Карэлія (Карэла-Фінскую ССР, з 1956 г. – РСФСР). Апроч гэтага, фіксуецца факт пераезду ў Латвійскую ССР на сталае пражыванне ці з мэтай працаўладкавання. Гэты кірунак працоўнай эміграцыі быў актуальны з міжваеннага часу, аб чым сведчаць матэрыялы вуснай гісторыі:

*"І вот, кагда я с эцім Сымончыкам разгаварывала, Ядзька, сястра наша, у Лепаі (заўв. Ліепая), і як ён узнаў што яна ў Лепаі, яна ж прыяжджала і ён прыхадзіў к нам (заўв. гаворка ідзе аб сустрэчы ў 2000-х гг.) і ён сказаў: "Я выязджаў у Амерыку з Лепаі і вазрашчаўся туды"* [1].

Апроч выезду працоўнай сілы ў выглядзе працаздольнай часткі насельніцтва, на тэрыторыі Докшыцкага раёна фіксуюцца факты рэпрэсій у дачыненні да заможнай часткі насельніцтва, асоб, якія адмаўляліся ад працы ў калгасе і ветэранаў Арміі Андэрса, якія вярнуліся да дому пасля сканчэння Другой сусветанай вайны. Сюжэт правядзення рэпрэсіўных мерапрыемстваў НКУС СССР у дачыненні да ветэрана Арміі Андэрса разгледжаны ў артыкуле Ю.І. Згірскага "Практыка выкарыстання фатаздымкаў пры аналізе матэрыялаў вуснай гісторыі на прыкладзе даследавання біяграфіі жаўнера Войска Польскага ў 1939-1957 гг." Згодна з ім, жыхар створанага ў 1940 годзе Докшыцкага сельсавета быў рэпрэсаваны двойчы:

1) 1939 г. – памешчаны ў лагер як ваеннапалонны. Гэта нельга разглядаць як частку рэпрэсій, так як ён з'яўляўся камбатантам Польскай Рэспублікі і апынуўся ў лагеры як жаўнер іншай дзяржавы.

2) 1951 г. – мэтанакіраваныя рэпрэсіі супраць жаўнераў Арміі Андэрса і членаў іх сем'яў [8, с. 349-354].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У матэрыялах вуснай гісторыі зафіксаваны факт правядзення рэпрэсіўных мерапрыемстваў у дачыненні да мясцовых жыхароў, якія ўхіляліся ад уступлення ў калгас [2]. У межах рэпрэсій па эканамічным прычынам, рэпрэсаваліся заможныя земляўладальнікі, як, напрыклад, Мар'ян Азямблоўскі з Сітцаўскага сельсавета. Дадатковым фактарам, уплывовым на цяжар прысуду і ўвагу з боку НКУС да асобы, з'яўляецца ўдзел апошняга ў працы даваеннага польскага дзяржаўнага апарата і супрацоўніцтва з міжваеннай польскай Дзяржаўнай Паліцыяй (польск. Policja Panstwowa) [7, с. 18].

Разам з перасоўваннем часткі працаздольнага насельніцтва, адбыліся змены ў руху сельскагаспадарчых прадуктаў і ў эканамічным жыцці ўсяго рэгіёна. Эканамічныя страты рэгіёна і разбурэнне былых сацыяльна-эканамічных сувязяў не спрыяла эканамічнаму развіццю рэгіёна. Сведчаннем цяжкага эканамічнага становішча з'яўляецца забарона на вываз хатняй жывёлы за межы Полацкай вобласці (заўв. Докшыцкі раён пэўны час быў ускладзе Полацкай вобласці), што тлумачыцца скарачэннем пагалоў'я хатняй жывёлы з 1939 па 1949 гг. [3, с. 6]. З мэтай паляпшэння эканамічнага становішча мясцовага насельніцтва, было арганізавана размеркаванне царкоўнай і касцельнай зямлі, зямлі былых буйных земляўгадальнікаў і тых, хто выехаў у Польшчу пад час абмену насельніцтвам паміж СССР і Польшчай пасля Другой сусветнай вайны. [4, с. 5]. Звычайна, на карысць адной сям'і захоўвалася каля 1,5 га. пры ўмове, аб чым сведчаць запісы ў Гаспадарчых кнігах за 1949-50-е гг [6, с. 44]. Працэс пераразмеркавання зямлі на карысць калгасаў і саўгасаў быў распачаты ў 1950 г., што, магчыма, звязана з запаздалымі тэмпамі рэалізацыі дзяржаўнага плана на тэрыторыях, якія да 1939 г. знаходзіліся ў складзе краіны з іншай сацыяльна-эканамічнай сістэмай, а з 1941 г. апынуліся пад нямецкай акупацыяй [3, с. 6].

Пры усім пры гэтым трэба памятаць аб асаблівасцях сацыяльна-эканамічнай сістэмы СССР, а менавіта аб планавай эканоміке. У межах рэалізацыі плана, у горадзе былі створаны прадпрыемствы лёгкай прамысловасці. Напрыклад: адкрыццё маслазавода ў г. Докшыцы ў 1947 г. [5, с. 17].

Апроч складанай эканамічнай сітуацыі, фіксуецца факт стварэння караўлаў у вёсках і асобных вуліцах мястэчак, што тлумачыцца складанасцю ў зябеспячэнні бяспекі праваахоўчымі органамі таго часу. Да гэтага прыцягваліся паўнагадовыя жыхары мужчынскага і жаночага полу (заўв. ад 18 да 60 гадоў) насельнага пункта ці вуліцы. [3, с. 3]. З мэтай ідэалагічнай выхавання насельніцтва, апроч агітацыі, выкарыстоўвалі і іншыя сродкі ўдзеяння на насельніцтва. Напрыклад, акцэнт на лесазагатоўках пасля вайны рабіўся як праз агітацыю, так і ў тагачаснай раённай газеце "Ленінская трыбуна". Адначасова з гэтым, у цэнтрах сельсаветаў арганізоўвалі гурткі, прыкладам чаго з'яўляецца гурток па вывучэнні біяграфіі і. Сталіна ў Параф'янаве аб чым сведчыць артыкул на першай старонцы раённай газеты "Ленінская трыбуна" ад 7 ліпеня 1949 г.

Такім чынам, дзякуючы архіўным матэрыялам і матэрыялам вуснай гісторыі, існуе магчымасць разгляду пасляваеннага становішча асобных мікрарэгіёнаў.

Вылучаюцца наступныя нюансы пасляваеннай рэчаіснасці тагачаснага Докшыцкага раёна, сельсаветы якога да 1939 г. знаходзіліся ў складзе Польскай Рэспублікі:

Заняцце галоўных кіруючых пасад у раёне выхадцамі з даваеннай тэрыторыі СССР. Пры гэтым, месцы ў дзяржапараце на месцах (заўв. узроўню сельсавета і гарсавета) займалі мясцовыя жыхары.

Ня гледзячы на цяжкое эканамічнае становішча, праз мясцовае кіраўніцтва, працягвалася рэалізацыя дзяржаўнага плана. Асобна вылучаецца мабілізацыя часткі працаздольнага насельніцтва на працы як у межах сельсавета, так і за межамі як раёна (заўв. Докшыцкага) і БССР.

Фіксуецца распачатак выбудоўвання новай (заўв. для тэрыторыі, якая да 1939 г. знаходзілася ў складзе міжваеннай Польшчы) сацыяльна-эканамічнай сістэмы. Элементы, якія разглядаліся як небяспечныя станавіліся аб'ектам увагі з боку НКУС СССР.

Адсутнасць недаверу да асноўнай масы мясцовага насельніцтва, якое да 1939 г. жыло ў складзе іншай краіны. Сведчаннем гэтага з'яўляецца выкарыстоўванне паўнагадовага насельніцтва пры арганізацыі караўлаў у межах вырашэння пытанняў грамадскай бяспекі.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Запісана ў 2022 г. Згірскім Ю. І. ад жанчыны 1948 г.н., з в. Курдзекі, Докшыцкага рана Віцебскай вобласці.
2. Запісана ў 2022 г. Згірскім Ю. І. ад жанчыны 1930 г.н., з в. Курдзекі, Докшыцкага р-н, Віцебскай вобласці.
3. Занальны дзяржаўны архіў г. Глыбокае (ЗГАГлб.). – Ф. 410. – Воп. 1. Спр. 1.
4. ЗГАГлб – Ф. 410. – Воп. 1. – Спр. 10.
5. ЗГАГлб – Ф. 410. – Воп. 1. – Спр. 16.
6. ЗГАГлб – Ф. 410. – Воп.2. – Спр. 2.
7. Занальны дзяржаўны архіў г. Маладзечна (ЗГАМал.) – Ф.509. – Воп.1. – Спр.50.
8. Згірскі, Ю. І. Практыка выкарыстання фатаздымкаў пры аналізе матэрыялаў вуснай гісторыі на прыкладзе даследавання біяграфіі даўнера Войска Польскага ў 1939 – 1957 гг. / Ю. І. Згірскі // АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ ИСТОЧНИКОВЕДЕНИЯ. Материалы VI Междунар. науч.-практ. конф.: сб. ст. / Витебский государственный университет имени П. М. Машерова; ред.: Е. Н. Богдашина, В. Г. Бовина-Лебедева – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2021. – С. 349–354.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова